3-12.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка

УДК 947.083 (476)

Забаўскі Мікалай Міхайлавіч

# ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ БАРАЦЬБА Ў БЕЛАРУСІ Ў ХОДЗЕ ВЫБАРАЎ І ДЗЕЙНАСЦІ РАСІЙСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ ДУМЫ I—IV СКЛІКАННЯЎ (1906—1917 гг.)

07.00.02 — айчынная гісторыя

АЎТАРЭФЕРАТ
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
доктара гістарычных навук

Віцебскі дзяржаўны
універсітэт
імя П. М. Машэрава
БІБЛІЯТЭКА

МІНСК 2000

63.3(4Беи)5
З-12

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка

Навуковы кансультант — доктар гістарычных навук, прафесар М. В. Біч

Афіцыйныя апаненты — доктар гістарычных навук, прафесар Д. У. Карэў

доктар гістарычных навук З. В. Шыбека

доктар гістарычных навук, прафесар Э. Р. Іофэ

*20504038*

Апаніруючая арганізацыя — Інстытут гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі

Абарона адбудзецца «29» чэрвеня 2000 г. у «15.00» гадзін на пасяджанні савета па абароне дысертацый Д 02.21.03 пры Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка па адрасу: 220050, г.Мінск, вул. Савецкая, 18, ауд. 482.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка.

Аўтарэферат разасланы 25.05.2000 г.

Вучоны сакратар савета па абароне дысертацый — кандыдат педагагічных навук, дацэнт І. І. Багдановіч

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць тэмы.** Пачатак XX ст. быў часам карэнных змен у Расійскай імперыі. У рэвалюцыйны рух уключаліся розныя пласты насельніцтва. Дзяржава і права, эканоміка і жыццё патрабавалі рэфармавання. На палітычнай арэне пачалі дзейнічаць манархічныя (урадавыя), ліберальныя і сацыял-дэмакратычныя партыі і групы. Яны мелі ўласныя канцэпцыі шляхоў развіцця краіны, сваё бачанне сродкаў дасягнення абвешчаных імі ідэалаў. Большасць з партый пры падтрымцы пэўных сацыяльных груп імкнуліся выкарыстаць Дзяржаўную думу для прапаганды і рэалізацыі сваіх праграмных палажэнняў. Гэта было магчымым толькі пры ўмове правядзення максімальнай колькасці сваіх дэпутатаў у Думу. Менавіта гэта акалічнасць надавала своеасаблівасць і вастрыню выбарчым кампаніям. Іх аналіз уяўляе выключную важнасць, паколькі дазваляе грунтоўна прааналізаваць размеркаванне палітычных сіл па губернях і рэгіёнах, вызначыць спецыфіку іх дзейнасці і ўзровень папулярнасці; адносіны з мясцовымі ўладамі. Урадавая палітыка ў заходніх губернях садзейнічала стварэнню тут спецыфічных умоў для правядзення выбараў. На іх фоне, як у люстэрку, адбіліся абставіны, у якіх на працягу другой паловы XIX — пачатку XX ст. развівалася беларуская культура, мова.

Сучасная палітычная сітуацыя ў краіне патрабуе звароту да гісторыі парламентарызму, якая даволі багатая сваімі традыцыямі і вопытам дзейнасці, у тым ліку на складаных, пераломных этапах гісторыі. Гэта дазваляе глыбей зразумець пазітыўны і негатыўны вопыт дзейнасці нашых папярэднікаў у вырашэнні галоўных пытанняў грамадска-палітычнага жыцця краіны, у першую чаргу аграрнага і нацыянальнага.

Ва ўмовах, калі выпрацоўваюцца асновы нацыянальнай палітыкі, калі існуюць дзве палаты вышэйшага заканадаўчага органа, асабліва важна акцэнтаваць увагу не столькі на першых кроках станаўлення парламентарызму, колькі на аналізе трансфармацыі поглядаў палітычных партый на нацыянальныя праблемы ў вышэйшай прадстаўнічай установе царскай Расіі. Пастаноўка нацыянальнага пытання ў Думе мае навуковае, пазнавальнае значэнне, а таксама выклікае палітычны і практычны інтарэс. Як і на пачатку XX ст., нацыянальныя лозунгі даволі папулярныя ў палітычнай барацьбе шматлікіх партый і рухаў, якія імкнуцца выкарыстаць у сваіх інтарэсах уздым нацыянальнай самасвядомасці. Найбольш яскрава апошняе праявілася ў імкненні да развіцця культуры, у першую чаргу адукацыі на роднай мове.

Вывучэнне гісторыі ўрадавых партый у той бурны перыяд дапаможа зразумець прынцыпы дзеяння ў Беларусі ідэй дзяржаўнасці, народнасці, сабornасці. На ўзбраенне манархістамі былі запазычаны погляды правячых колаў яшчэ з першай паловы XIX ст., калі стрыжнем дзяржаўнай палітыкі стала формула — «праваслаўе, самадзяржаўе, народнасць». Менавіта яна склала аснову ідэалагічнай канцэпцыі манархічных саюзаў, дзейнасць якіх у адзінстве з праваслаўнай царквой істотна ўплы-

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



вала на размеркаванне палітычных сіл у краі і, безумоўна, патрабуе даследавання.

Нельга абысці ўвагай дзейнасць партый народніцкага тыпу, асабліва БСГ і эсэраў. Апошнія з'яўляліся адной з буйнейшых і ўплывовых апазіцыйных агульнарасійскіх партый, якія надавалі вялікую ўвагу этнічным праблемам і імкнуліся да ўстанаўлення кантактаў з нацыянальнымі арганізацыямі і рухамі.

Зварот да гісторыі ліберальных партый узбройвае нас павучальным вопытам. Неабходна высветліць, чаму расійскі лібералізм, пры ўсёй моцы эканамічнай падтрымкі з боку буржуазіі, не змог дасягнуць істотных палітычных вынікаў: змяніць курс урада, прадухіліць рэвалюцыю. Аналіз праграм ліберальных партый, якія дзейнічалі і ў Беларусі, паказвае, што ў аснове расійскага лібералізму знаходзілася прагрэсіўная канцэпцыя прававой дзяржавы, у якой выканаўчая ўлада была б падпарадкавана заканадаўчай, дзе гаспадарылі б закон і законнасць. Акцэнтоўваецца ўвага на тым, што ліберальны лагер у заходніх губернях быў самым слабым звяном у ланцугу палітычных сіл.

Першы вопыт парламентарызму не атрымаў, як вядома, свайго арганічнага развіцця. Неабходна дэталёва вывучаць гісторыю дарэвалюцыйнай Думы з тым, каб у ходзе сучасных палітычных баталій, выкарыстаўшы ўрокі мінулага, пазбегнуць фатальных памылак.

Усё падкрэсленае і вызначае актуальнасць і асноўныя задачы дысертацыі.

**Сувязь працы з буйнейшымі навуковымі праграмамі, тэмамі.** Работа выканана па ініцыятыве аўтара. Тэма даследавання па праблеме «Гісторыя Беларусі» зацверджана Навуковым саветам Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР 15 кастрычніка 1993 г. (пратакол № 2) і Вучоным саветам Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка 29 чэрвеня 1995 г. (пратакол № 9).

**Мэта і задачы даследавання.** Галоўнай ***мэтай*** працы з'яўляецца комплексны разгляд барацьбы правых (урадавых), ліберальных, народніцкіх і сацыял-дэмакратычных партый і груп Беларусі ў перыяд выбараў і дзейнасці Расійскай Дзяржаўнай думы I—IV скліканняў, аналіз іх адносін да самадзяржаўя, аграрнага, нацыянальнага і іншых пытанняў грамадска-палітычнага жыцця краіны, а таксама спецыфіка іх дзейнасці ў заходніх губернях.

У адпаведнасці з вызначанай мэтай аўтарам рашаюцца наступныя ***задачы:***

— характарызуецца сутнасць «Палажэння аб выбарах у Дзяржаўную думу» ад 6 жніўня 1906 г. і ўказа «Аб змяненні Палажэння аб выбарах у Дзяржаўную думу» і выданых у дадатак да яго ўзаконенняў ад 11 снежня 1906 г. і спецыфіка іх прымянення ў Беларусі;

— вызначаюцца асаблівасці выбарчага закону ад 3 чэрвеня 1907 г. у адносінах да заходніх губерняў, накірункі ўрадавай палітыкі;

— разглядаюцца адносіны да Думы беларускага сялянства, рабочага класа, гараджан, буржуазіі, духавенства, чыноўнікаў, памешчыкаў;

— аналізуецца ход выбараў і іх вынікі ў чатыры дарэвалюцыйныя Думы на ўсіх стадыях у Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губернях;

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


— вызначаюцца адносіны дэпутатаў ад Беларусі да самадзяржаўя, іх пазіцыі ў Думе па аграрнаму, рабочаму, нацыянальнаму і іншых пытаннях;

— выяўляюцца асаблівасці грамадска-палітычнай барацьбы ў Беларусі ў 1906—1917 гг.;

— раскрываюцца праблемы мясцовага кіравання ў заходніх губернях у трэцячэрвеньскі перыяд;

— звяртаецца ўвага на палітычныя ўмовы ў Беларусі, у якіх развівалася беларуская культура і мова ў 1906—1917 гг.

**Аб'ект і прадмет даследавання.** ***Аб'ектам*** нашага даследавання з'яўляецца грамадска-палітычная барацьба — адна з форм узаемадзеяння розных палітычных сіл у мэтах дасягнення пэўных палітычных інтарэсаў.

Палітычная барацьба можа набываць розныя формы вырашэння, у тым ліку парламенцкая дзейнасць, супрацьстаянне і блакіраванне палітычных партый на выбарах у залежнасці ад палітычнай сітуацыі, ступені вастрыні ўзаемаадносін паміж суб'ектамі палітычных адносін.

***Прадмет*** даследавання — палітычныя партыі — актыўныя суб'екты палітычнага жыцця, важны элемент палітычнай сістэмы, выступаючы ў ролі пасрэдніка паміж дзяржавай і грамадствам. Прапанаваная ў рабоце партыйная класіфікацыя заснавана на сацыяльна-класавых і ідэалагічных прыкметах, па метадах перабудовы грамадства і арыентацыі: манархічныя (урадавыя), ліберальныя, сацыял-дэмакратычныя, партыі народніцкага тыпу.

Храналагічныя рамкі дысертацыі ахопліваюць 1906—1917 гг., ад пачатку падрыхтоўкі і склікання першага народнага прадстаўніцтва з заканадаўчымі паўнамоцтвамі да спынення дзейнасці IV Дзяржаўнай думы. Прапанаваны храналагічны перыяд дазваляе паслядоўна прасачыць барацьбу партый і груп у Беларусі за галасы электарата ва ўсіх чатырох выбарчых кампаніях, а таксама прааналізаваць пазіцыі дэпутатаў ад 5 заходніх губерняў у Думе, вызначыць напрамкі ўрадавай палітыкі, грамадска-палітычнай барацьбы ў Беларусі ў люстэрку існавання Думы. Нават схематычны пералік падзей (гады першай расійскай рэвалюцыі, падзеі 3 чэрвеня 1907 г. і прыняцце новага выбарчага закону, істотна абмежаваўшага нацыянальнае прадстаўніцтва ў Думе, пачатак першай сусветнай вайны, наспяванне рэвалюцыі), на фоне якіх праходзіла дзейнасць I—IV Дум, сведчыць аб значнасці вызначанага перыяду. У 1905—1907 гг. адбываецца ўздым нацыянальна-вызваленчых рухаў, у тым ліку і беларускага, палітычныя партыі канкрэтызуюць у праграмах і на практыцы свае нацыянальныя патрабаванні.

У перыяд з 3 чэрвеня 1907 г. да лютаўскіх падзей 1917 г. партыям прыйшлося дзейнічаць ва ўмовах жорсткага ўціску з боку аўтарытарнага рэжыму, што дазваляе прасачыць увесь спектр іх тактычных дзеянняў і прааналізаваць характар іх гістарычнай эвалюцыі.

Акрамя таго, выбар храналагічных рамак абумоўлены навуковай актуальнасцю, паколькі ў беларускай гістарыяграфіі адсутнічаюць працы, у якіх грамадска-

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


палітычная барацьба разглядалася б у комплексе, асабліва ў перыяд міжрэвалюцыйнага дзесяцігоддзя.

Тэрытарыяльныя рамкі даследавання — ход і вынікі выбараў у Дзяржаўную думу I—IV скліканняў аналізуюцца па ўсіх 5 заходніх губернях. У сучасныя граніцы Беларусі з іх цалкам уваходзяць Мінская і Магілёўская губерні, Вілейскі, Дзісненскі, Лідскі, Ашмянскі паветы Віленскай губерні, Гродзенскі, Брэсцкі, Ваўкавысцкі, Кобрынскі, Пружанскі, Слонімскі паветы Гродзенскай губерні, Віцебскі, Гарадоцкі, Дрысенскі, Лепельскі, Полацкі паветы Віцебскай губерні. Выдзяліць сучасную беларускую тэрыторыю не ўяўляецца магчымым, так як заключныя стадыі выбараў праходзілі ў губернскіх гарадах (у тым ліку і ў Вільні), а дэпутаты ў Думу абіраліся ад губерні ў цэлым.

**Метадалогія і метады праведзенага даследавання.** Метадалагічнай асновай дысертацыі з'яўляецца сукупнасць навуковых прынцыпаў, метадаў і прыёмаў гістарычнага пазнання. Правядзенне любога даследавання патрабуе ад навукоўца прытрымлівацца агульных навуковых падыходаў, што вызначаюць характар і сутнасць аналізу вывучаемых з'яў і працэсаў. Аўтар дысертацыі абапіраўся на прынцыпы гістарызму, аб'ектыўнасці, на партыйна-класавы і каштоўнасны падыходы. Але прынцыпы самі па сабе не дазваляюць вырашаць канкрэтныя задачы. Для іх рэалізацыі выкарыстоўваўся комплекс канкрэтна-гістарычных (генетычны, параўнальны, тыпалагічны, сістэмны ды інш.) і агульнанавуковых метадаў (індукцыі, дэдукцыі, сінтэзу і аналізу, ідэалізацыі, мадэліравання ды інш.). У працэсе даследавання ўлічваліся дасягненні айчыннай гістарычнай і грамадска-палітычнай думкі па праблемах расійскага парламентарызму, палітычных партый і рухаў і работы сучасных аўтараў.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў** заключаецца як у самой пастаноўцы праблемы ў такой плоскасці, так і ў тым, што на аснове комплекснага аналізу новага, канкрэтнага, фактычнага матэрыялу і з улікам праведзеных раней даследаванняў упершыню прадпрынята спроба абагульнення гістарычнага вопыту дзейнасці галоўных палітычных партый і груп у Беларусі ў ходзе выбарчых кампаній і работы Думы I—IV скліканняў.

Выкарыстанне не даследаваных да гэтага часу крыніц дапамагло раскрыць сувязі органаў дзяржаўнай улады ў Беларусі з манархічнымі арганізацыямі, абагульніць гістарычны вопыт дзейнасці ліберальных, народніцкіх і сацыял-дэмакратычных партый і груп у ходзе выбараў у Думу, прааналізаваць эвалюцыю іх стратэгіі і тактыкі ў сувязі са зменай у выбарчым заканадаўстве.

Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі ў дысертацыі праведзены грунтоўны аналіз ходу і вынікаў выбараў у Думу ад 5 заходніх губерняў на ўсіх стадыях. Гэта дазволіла аўтару прасачыць адносіны да Думы розных сацыяльных пластоў насельніцтва, паказаць уплыў на іх палітычных партый праз органы друку, вусную агітацыю, з'езды і іншыя форумы. Падкрэслены істотны ўплыў на грамадска-палітычную барацьбу ў Беларусі ў 1906—1917 гг. праваслаўнага і каталіцкага

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


духавенства, што адлюстравалася і ў ходзе выбарчых кампаній, і ў выступленнях святароў-дэпутатаў у Думе.

У працы створана агульная карціна дзейнасці Дзяржаўнай думы і прааналізаваны выступленні расійскіх палітычных лідэраў, дэпутатаў ад Беларусі па галоўных пытаннях грамадска-палітычнага жыцця краіны, у першую чаргу аграрнага і нацыянальнага. Асаблівая ўвага нададзена актыўнасці палітычных партый у сувязі з разглядам у Думе і правядзеннем земскай рэформы ў заходніх губернях.

У навуковы зварот уключана значная колькасць архіўных матэрыялаў, вызначаючых адносіны палітычных партый да Думы і яе ролі ў эканамічным і палітычным жыцці краіны.

Даследаванне думскай тэматыкі дазволіла аўтару абагульніць першы вопыт беларускіх парламентарыяў, раскрыць новыя аспекты ўмоў, у якіх развівалася беларуская мова і культура ў 1906—1917 гг.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў** вызначаецца актуальнасцю і навізной тэмы дысертацыі. Фактычны матэрыял, асноўныя палажэнні і высновы могуць быць выкарыстаны ў працэсе далейшай тэарэтычнай распрацоўкі праблем грамадска-палітычнага жыцця, пры напісанні прац па гісторыі парламентарызму, палітычных партый, а таксама гістарыяграфічных публікацый. Тэкст дысертацыі разам са спісам крыніц і літаратуры, дапаўненнямі і дадаткамі, можа служыць даведнікам пры падрыхтоўцы курсаў лекцый па гісторыі Расіі і Беларусі, спецкурсаў па праблемах палітычных партый і для ўсіх, хто займаецца і цікавіцца праблемамі беларускай і расійскай гісторыі пачатку XX ст.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону**

- Палітычная барацьба ў беларуска-літоўскіх губернях, у параўнанні з цэнтрам краіны, істотна ўскладнялася ў сувязі са шматнацыянальным і стракатым канфесійным складам насельніцтва. Акрамя агульнарасійскіх партый, тут дзейнічалі шматлікія нацыянальныя буржуазныя і дробнабуржуазныя партыі і групоўкі (яўрэйскія, польскія, беларускія, літоўскія). Шавіністычная палітыка царызму і правых, урадавых партый, узмацняла ў іх асяроддзі нацыяналістычныя памкненні, міжусобную барацьбу, але ў цэлым палітычныя сілы і партыі ў Беларусі, як і ў Расіі, размеркаваліся па наступных лагерах: манархічны (урадавы), ліберальны, народніцкі і сацыял-дэмакратычны.

- Мясцовыя органы дзяржаўнай улады ў 5 заходніх губернях у час выбарчых кампаній і ў перыяд работы Думы абапіраліся на крайне правыя, шавіністычныя арганізацыі «Саюз рускага народа», «Русский окраинный союз», прымыкаўшыя да іх у перыяд III і IV Дум арганізацыі «Крестьянин», пазней «Белорусское общество», а таксама праваслаўныя брацтвы.

- Пазіцыі партыі кадэтаў і іншых ліберальных партый і груп у заходніх губернях былі непараўнальна слабейшымі, чым у цэнтральных губернях, паколькі мясцовую буржуазію раздзіралі нацыянальна-рэлігійныя супярэчнасці, а польская і

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



яўрэйская буржуазія да таго ж па новаму выбарчаму закону ад 3 чэрвеня 1907 г. была пазбаўлена магчымасці ўплываць на вынікі выбараў.

•Улічваючы ўрокі рэвалюцыі 1905—1907 гг. і з мэтаю барацьбы з вызваленчым рухам, царскі ўрад зрабіў стаўку на распальванне шавінізму сярод рускага насельніцтва, асабліва ў нацыянальных рэгіёнах, што праявілася ў падзеле вясковага насельніцтва Беларусі і Літвы па закону ад 3 чэрвеня 1907 г. па нацыянальна-рэлігійнай прыналежнасці на «рускую» і «польскую» (нярускую) курыі, ва ўвядзенні нацыянальных аддзяленняў («рускага», «польскага» і «яўрэйскага») у гарадскіх курыях, у наданні яўных перавагаў на выбарах «рускай» курыі. Далучаючы праваслаўнае беларускае насельніцтва да «рускай», а каталіцкае да «польскай» курый, царскі ўрад тым самым адмаўляў факт існавання беларускага этнасу і ствараў істотныя перашкоды на шляху яго развіцця.

•Дэпутаты правых партый ад беларуска-літоўскіх губерняў, у тым ліку сяляне, актыўна падтрымлівалі палітыку ўрада, аграрную і земскую рэформы П.А.Сталыпіна. Па аграрнаму пытанню частка сялянскіх дэпутатаў ад Беларусі выказвалася за неабходнасць надзялення зямлёй малазямельных сялян. У ходзе перадвыбарчай барацьбы ў правых органах друку, у думскіх спрэчках выявілася імкненне праваслаўнага беларускага заможнага сялянства з дапамогай улад дабіцца абмежавання польскага памешчыцкага землеўладання ў беларуска-літоўскіх губернях і павелічэння за іх кошт уласных. Звязваючы ажыццяўленне сваіх інтарэсаў з палітыкай царызму, думскія прадстаўнікі праваслаўнага заможнага беларускага сялянства і яго групоўкі на месцах («Крестьянин», «Белорусское общество») вялі барацьбу з беларускім нацыянальным рухам, газетай «Наша ніва». Такую ж пазіцыю ў адносінах да гэтага руху займалі і польскія памешчыкі, клерыкалы і думскія дэпутаты ад Віленскай губерні («Польска-літоўска-беларуская група»).

•Нягледзячы на ўсю ліберальную бачнасць (увядзенне бессаслоўнасці ў земстве, павелічэнне прадстаўніцтва ад дробных уласнікаў), закон ад 14 сакавіка 1911 г. аб прымяненні Палажэння аб земскіх установах ад 12 чэрвеня 1890 г. да губерняў Віцебскай, Валынскай, Кіеўскай, Магілёўскай, Мінскай і Падольскай па свайму зместу быў адным з самых рэакцыйных з усіх, якія былі прыняты ў трэцячэрвеньскі перыяд. Увядзеннем самакіравання ў заходніх губернях урад садзейнічаў распальванню тут нацыянальнай варожасці, умацаванню палітычнага і эканамічнага становішча «рускіх» землеўладальнікаў і праваслаўнага духавенства, стварэнню ўмоў для палітыкі русіфікацыі мясцовага сялянства і барацьбы з беларускім нацыянальна-вызваленчым рухам. Нарэшце, увядзенне земства давала магчымасць пакончыць з манаполіяй каталіцкага прадстаўніцтва ў Дзяржаўным Савеце ад заходніх губерняў.

•Абаронцамі інтарэсаў працоўных мас Беларусі былі трудавікі, да іх прымыкалі і некаторыя дэпутаты сяляне ад заходніх губерняў. Іх падтрымлівала газета «Наша ніва», народніцкая па характару. Іх дзейнасць у Думе і па-за Думай садзейнічала росту палітычнай і нацыянальнай свядомасці беларусаў.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



**Асабісты ўклад суіскальніка.** Дысертацыя з'яўляецца самастойна выкананай даследчай працай. Яна напісана на аснове апублікаваных і архіўных крыніц, матэрыялаў перыядычнага друку, значная частка якіх упершыню ўводзіцца ў навуковы абарот.

Пастаўленыя аўтарам задачы і падыход да іх вырашэння дазволілі выпрацаваць новае бачанне палітычнай сітуацыі ў Беларусі ў перыяд выбарчых кампаній, работы Дзяржаўнай думы і кірунак дзейнасці ўрада.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Вынікі навуковых даследаванняў аўтара, якія ўключаны ў дысертацыю, апрабаваны на рэспубліканскіх канферэнцыях: «Сельская гаспадарка і сялянства Беларусі» (Гомель, 1989 г.), «Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь (новыя канцэпцыі і падыходы)», «Парламент у дзяржаўна-прававой сістэме» (Мінск, 1997 г.), «Гісторыя Беларусі: новае ў даследаванні і выкладанні» (Мінск, 1999 г.), «Гістарыяграфія. Гісторыя Беларусі: стан і перспектывы развіцця» (Мінск, 1999 г.), на міжнародных навуковых і навукова-практычных канферэнцыях: «Першая расійская рэвалюцыя 1905—1907 гг. у святле новага гістарычнага мыслення» (Горлаўка, 1990 г.), «Недзяржаўная выдавецкая дзейнасць у Беларусі. Гісторыя і сучаснасць» (Мінск, 1997 г.)

**Апублікаванасць вынікаў.** Аўтарам выдадзены манаграфіі: «Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906—1917 гг.). — Мінск: Бел. дзярж. пед. ун-т. — 1999. — 212 с.; «Прадстаўніцтва ад Беларусі ў Дзяржаўнай думе Расіі (1906—1917 гг.)». — Мінск: Бел. дзярж. пед. ун-т. — 1998. — 156 с. (у сааўт. з У.С.Пуцікам), а таксама артыкулы і тэзісы ў навуковых часопісах і зборніках. Па выніках навуковых канферэнцый апублікаваны даклады і тэзісы дакладаў. Агульны аб'ём публікацый каля 600 старонак.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, асноўнай часткі, якая ўключае пяць глаў, заключэння, спіса крыніц і літаратуры, дадаткаў і табліц. Поўны аб'ём дысертацыі — 205 с. Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры ўключае 505 найменняў і займае 28 старонак.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

**Уводзіны** ўключаюць аналіз асаблівасцей грамадска-палітычнай барацьбы ў Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губернях у пачатку XX ст., якія былі больш складанымі, чым у цэнтральных губернях Расійскай імперыі. Разглядаецца спецыфіка класавага, нацыянальнага і канфесійнага складу насельніцтва рэгіёна.

**Агульная характарыстыка работы** складаецца з абгрунтавання актуальнасці тэмы, мэты і задач, аб'екта і прадмета, храналагічных і тэрытарыяльных рамак, метадалогіі і метадаў даследавання. Тут вылучаецца навуковая навізна і практычнае значэнне дысертацыі. Вызначаецца гіпотэза і асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону. Паказаны апрабацыя вынікаў дысертацыі, колькасць апублікаваных работ, структура і аб'ём дысертацыі.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


Магілёўскай губернях (579 чалавек) павялічылася ў параўнанні з выбарамі ў II Думу (542). Гэта акалічнасць тлумачылася ўзрастаючым уплывам правых і праваслаўных святароў і адбілася на партыйным складзе губернскіх выбаршчыкаў.

На Гродзеншчыне і Мінщчыне значны ўплыў на ход выбараў аказалі прагрэсісты. У выніку іх дзейнасці па гарадскіх курыях прайшло 108 выбаршчыкаў, у час выбараў у III Думу — 77 [1, 2, 4, 17, 24, 25, 26, 30, 42, 43, 45, 47].

10. Правая большасць выбаршчыкаў паўплывала і на партыйны склад дэпутатаў IV Думы 5 заходніх губерняў. «РОС», СРН і вялікадзяржаўныя нацыяналісты заваявалі 27 месц у Думе, акцябрысты — 3, лібералы — 6. Кадэты ў Думе ўнеслі некалькі законапраектаў аб дэмакратычных «свабодах», законапраект аб усеагульным выбарчым праве. Усе выступленні акцябрысцка-кадэцкага альянсу выклікалі негатыўную рэакцыю правай часткі Думы. Правыя патрабавалі ад урада ўзмацнення рэпрэсій, утаймавання «іншародцаў», узмоцненай увагі да царкоўна-прыходскіх школ. Дэпутаты ад Беларусі цвёрда стаялі на пазіцыі правых і нацыяналістаў. Сапраўдных абаронцаў сацыяльных і нацыянальных правоў беларускага народа ў IV Думе не было. «Истинно-русские» і іх органы друку ў Беларусі не хацелі прызнаваць, што выспявае новая рэвалюцыя, што ўрадавая палітыка церпіць крах і што нават партыі думскай большасці змянілі тактыку і перайшлі да канфрантацыі з урадам. Іх клапаціла тое, што «прагрэсіўныя партыі ўсё больш рашуча станавіліся на бок палякаў і яўрэяў». Нападкі на палякаў урэшце выліваліся супраць газеты «Наша ніва».

Уступленне Расіі ў вайну прывяло да ўсплеску шавіністычных настрояў у краіне. Правыя, акцябрысты і прагрэсісты, забыўшы палітычныя рознагалоссі, уключыліся ў антыгерманскую кааліцыю. У ліпені 1915 г. у Думе быў створаны «Прагрэсіўны блок», у які ўвайшоў і дэпутат ад Беларусі Ф.І. Лашкейт. У заходніх губернях правы друк, у прыватнасці газеты «Виленский вестник», «Северо-западная жизнь», рэзка выступіў супраць створанага ў Думе блока, абвінавачваючы яго ў пашырэнні правоў яўрэяў [1, 2, 4, 7, 11, 15, 17, 18, 33, 36, 37, 42—47].

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ


1. Забаўскі М.М. Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906—1917 гг.). — Мінск: Бел. дзярж. пед. ун-т, 1999. — 212 с.
2. Забаўскі М.М., Пуцік У.С. Прадстаўніцтва ад Беларусі ў Дзяржаўнай думе Расіі (1906—1917 гг.). — Мінск: Бел. дзярж. пед. ун-т, 1998. — 157 с. (Сааўт. У.С.Пуцік).
3. Забаўскі М.М. Барацьба на два франты (з гісторыі газеты «Наша ніва» //Старонкі гісторыі Беларусі. — Мінск: «Навука і тэхніка», 1992. — С.124—131.
4. Забавский Н.М. Депутаты от Беларуси в Российской Государственной думе в 1906—1917 гг. //Об итогах работы второй сессии Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь (2 апреля — 27 июня 1997 года) //Информационно-аналитические материалы. — Минск: Полиграф. предпр. Управ. Делами Президента Республики Беларусь, 1997. — С. 128—138.
5. Забаўскі М.М. Грамадска-палітычная барацьба ў Беларусі ў сувязі з увядзеннем земства ў Беларусі //Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. — 1987. — № 1. — С. 61—69.
6. Забаўскі М.М. Палітычная барацьба ў Беларусі ў перыяд выбараў у III Дзяржаўную думу //Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. — 1987. — № 5. — С. 74—82.
7. Забавский Н.М. Национальный вопрос в общественно-политическом движении в Белоруссии в период III Государственной думы (1907—1912 гг.). — Минск, 1988. — 35 с. — Депон. В ИНИОН АН СССР от 23.09.88 г. № 35635.
8. Забавский Н.М. Аграрный вопрос в общественно-политическом движении в Белоруссии в период III Государственной думы (1907—1912 гг.) //Сельское хозяйство: История, современный опыт и перестройка (г. Гомель, 27—29 октября): Тез. докл. конф. — Минск, 1988. — С. 110—112.
9. Забавский Н.М. Общественно-политическая борьба в Белоруссии в связи с выборами и деятельностью III Государственной думы (1907—1912гг.) //Автореф. дис. ... канд. ист. наук. — Минск: 1998. — 19 с.
10. Забавский Н.М. Представительство Белоруссии в III Думе (1 ноября 1907 г. — 9 июня 1912 гг.) //Реферативный сборник отдела научной информации по общественным наукам АН БССР: Реферат статьи Я.Запрудника. — Минск, 1990. — № 2. — С. 16—20.
11. Забавский Н.М. Об освещении национальных движений в период революции 1905—1907 гг. (по материалам Белоруссии) //Первая российская революция 1905—1907 гг. в свете нового исторического мышления: Тез. докл. и сообщений респ. науч. конф. — Горловка, 1990. — Т. I — С.135—136.
12. Забавский Н.М. Аграрный вопрос в освещении газеты «Наша ніва» (1907—1914 гг.) //Тез. науч. конф. «Исторический опыт крестьянства»: Свердловск, 1990. — С. 27—29.
13. Забавский Н.М. Аграрный вопрос в общественно-политическом движении в Белоруссии в период III Государственной думы (1907—1912 гг.) //Сельская гаспадарка і сялянства Беларусі: Матэрыялы навук. канф. г. Гомель. — Мінск: ЦНБ АНБ, 1991. — С.150—156.
14. Забаўскі М.М. Моўнае пытанне ў адукацыі і палітычным жыцці Беларусі ў трэцячэрвеньскі перыяд (1907—1912 гг.) //Адукацыя. Гісторыя. Тэматычны

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



зборнік навуковых прац па беларусазнаўству. Брэст. — 1992. — С. 36—38.

15. Забаўскі М.М. Дзяржаўная дума ў палітычным жыцці Беларусі (1906—1917 гг.) — Мінск: МДПІ імя А.М.Горкага, 1993. — 35 с.
16. Забаўскі М.М. Ахоўныя аддзяленні на Беларусі //Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1993. — Т. 1. — С. 236. (Сааўт. А.Я.Сукала).
17. Забаўскі М.М. Дзяржаўная дума ў палітычным жыцці Беларусі/ /Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь (новыя канцэпцыі і падыходы): Матэрыялы Усебел. канф. гісторыкаў (Мінск, 3—5 лютага 1993 г.). — Тэз. дакл. — Мінск: БДУ, 1993. — ч. II. — С. 184—186.
18. Забаўскі М.М. Беларускае таварыства //Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1993. — Т. 1. — С. 359.
19. Забаўскі М.М. Расоншчына ў канцы XIX — пачатку XX ст. //«Памяць» — гісторыка-дакументальная хроніка Расонскага раёна. — Беларуская энцыклапедыя, 1994. — С.50—54.
20. Забаўскі М.М. Брэсцкая жаночая гімназія. //Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1994. — Т. 2. — С. 94.
21. Забаўскі М.М. Брэсцкая мужчынская гімназія //Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1994. — Т.2. — С.97.
22. Забаўскі М.М. Ахоўныя аддзяленні //Беларуская энцыклапедыя. — Мінск, 1996. — С. 154. (Сааўт. А.Я.Сукала).
23. Забаўскі М.М. Глыбоччына ў другой палавіне XIX — пачатку XX стагоддзя. //Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Глыбоцкага раёна. — Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1995. — С. 77—86.
24. Забаўскі М.М. Саюз рускага народа //Беларусь: Энцыклапедычны даведнік. — Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1995—1996. — С. 135.
25. Забаўскі М.М. Сталыпінская аграрная рэформа. //Беларусь: Энцыклапедычны даведнік. — Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1995—1996. — С.99—100.
26. Забаўскі М.М. Дзяржаўная дума //Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1996. — Т. 3. — С. 240—243.
27. Забаўскі М.М., Замыслоўскі Г.Г. //Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1996. — Т. 3. — С. 403.
28. Забаўскі М.М. У барацьбе за нацыянальнае адраджэнне (Да 90-годдзя выхаду ў свет першага нумара «Нашай нівы») //Недзяржаўная выдавецкая дзейнасць у Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 3—4 кастрычніка 1996 г.). — Мінск, 1997. — С.32—24.
29. Забаўскі М.М. Расійская Дзяржаўная дума першага склікання ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі //Пытанні гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі: Зб. арт. — Мінск: Бел. дзярж. пед. ун-т., 1997. — С. 95—102.
30. Забаўскі М.М. Кадэты //Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1997. — Т. 4. — С. 5.
31. Забавский Н.М. Крестьянин //Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1997. — Т. 4. — С. 260.
32. Забаўскі М.М. Грамадска-палітычная барацьба ў Беларусі ў час выбараў у II Дзяржаўную думу Расіі //Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 1998. — № 2. — С. 69—77.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


33. Забаўскі М.М. Палітычныя пазіцыі дэпутатаў ад беларускіх губерняў у IV Дзяржаўнай думе Расіі //Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. — 1998. — № 3 . — С. 74—80.

34. Забаўскі М.М. Нацыянальнае пытанне і палітычныя пазіцыі дэпутатаў ад Беларусі ў III Дзяржаўнай думе Расіі (1907—1912 гг.) //Весці Бел. дзярж. пед. ун-та. — 1998. — № 2. — С. 97—104.

35. Забаўскі М.М. Аграрнае пытанне ў Расійскай Дзяржаўнай думе III склікання і пазіцыі дэпутатаў ад Беларусі //Весці Бел. дзярж. пед. ун-та. — 1998. — № 1. — С. 59—70.

36. Забаўскі М.М. Нацыянальна-рэлігійная палітыка царызму, урадавых партый і арганізацый на Беларусі (канец XIX ст. — 1917 г.) //Культурна-нацыянальныя працэсы на Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст.: Зб навук. прац. — Мінск: Бел. дзярж. пед. ун-т. — 1998. — С. 125—144.

37. Забаўскі М.М. Дзейнасць урадавых, ліберальных, народніцкіх і сацыял-дэмакратычных партый у Беларусі ў перыяд выбараў у Расійскую Дзяржаўную думу IV склікання (1912 г.) //Культурна-нацыянальныя працэсы на Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст.: Зб навук. прац. — Мінск, 1998. — Вып. II. — С. 18—31.

38. Забаўскі М.М. Ліберальныя партыі і групоўкі ў Беларусі на выбарах у III Дзяржаўную думу Расіі //Весці Бел. дзярж. пед. ун-та. — 1999. — № 1. — С. 60—66.

39. Забаўскі М.М.Сацыял-дэмакратычныя і народніцкія партыі і групоўкі на выбарах у III Дзяржаўную думу Расіі (1907 г.) //Весці Бел. дзярж. пед. ун-та. — 1999. — № 2. — С. 111—118.

40. Забаўскі М.М. Газета «Окраины России» — праваднік урадавай нацыянальнай палітыкі ў заходніх губернях (1906—1912 гг.) //Гісторыя Беларусі: новае ў даследаванні і выкладанні: Матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канф. (Мінск, 27 сак. 1999 г.). — Мінск, 1999. — С. 35—37.

41. Забаўскі М.М.Палітычны рух у Беларусі ў час выбараў у I Расійскую думу (студзень — красавік 1906 г.) //Весці Бел. дзярж. пед. ун-та. — 1999. — № 3. — С. 103—110.

42. Забаўскі М.М. Манархічныя партыі //Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1999. — Т. 5. — С. 64—65.

43. Забаўскі М.М.Мірнаабнаўленцы //Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1999. — Т. 5. — С. 206.

44. Забаўскі М.М. Окраины России //Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1999. — Т. 5. — С. 352. (Сааўт. І.І.Забаўская).

45. Забаўскі М.М. Польскі дэмакратычны саюз Беларусі //Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1999. — Т. 5. — С. 547.

46. Забаўскі М.М. Прагрэсісты //Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1999. — Т. 5. — С. 559.

47. Забаўскі М.М. Крестьянин //Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. — Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1999. — Т. 8. — С. 473.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


## РЭЗЮМЭ

Забаўскі Мікалай Міхайлавіч

## ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ БАРАЦЬБА Ў БЕЛАРУСІ Ў ХОДЗЕ ВЫБАРАЎ І ДЗЕЙНАСЦІ РАСІЙСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ ДУМЫ I — IV СКЛІКАННЯЎ (1906 — 1917 ГГ.)

*Дзяржаўная дума, выбарчая сістэма, курс палітычны, выбарчае права, барацьба палітычная, блок палітычны, партыя палітычная, акцябрысты, кадэты, эсэры, прагрэсісты, праваслаўныя брацтвы, дэпутаты, пытанне нацыянальнае, пытанне аграрнае, земствы, беларускія губерні.*

***Аб'ект даследавання*** — грамадска-палітычная барацьба ў Беларусі ў вызначаны храналагічны перыяд.

***Мэта даследавання*** — комплексны разгляд барацьбы манархічных, ліберальных, народніцкіх і сацыял-дэмакратычных партый і груп у Беларусі ў перыяд выбараў і дзейнасці Расійскай Дзяржаўнай думы I—IV скліканняў, аналіз іх адносін да важнейшых пытанняў грамадска-палітычнага жыцця краіны, а таксама спецыфікі іх дзейнасці ў заходніх губернях.

Аўтар даследуе кірункі ўрадавай палітыкі ў Беларусі ў 1906—1917 гг. і яе ўплыў на вынікі выбараў у I—IV Думы.

***Навізна атрыманых вынікаў*** вызначаецца новымі падыходамі, якія дазволілі ўпершыню правесці комплексны аналіз грамадска-палітычнай сітуацыі, якая склалася ў заходніх губернях у перыяд Дзяржаўнай думы Расіі, прааналізаваць адносіны да Думы розных сацыяльных пластоў насельніцтва. Выкарыстанне не даследаваных да гэтага часу крыніц дазволіла стварыць агульную карціну дзейнасці Дзяржаўнай думы і прасачыць пазіцыі першых беларускіх парламентарыяў па аграрнаму і нацыянальнаму пытаннях, іх адносіны да самадзяржаўя. У рабоце раскрыты новыя аспекты ўмоў, у якіх у 1906 — 1917 гг. развівалася беларуская мова і культура.

Высновы даследавання, фактычны матэрыял могуць быць выкарыстаны ў працэсе далейшай тэарэтычнай распрацоўкі праблем грамадска-палітычнага жыцця, пры напісанні прац па гісторыі парламентарызму, палітычных партый, а таксама гістарыяграфічных публікацый. Тэкст дысертацыі, разам са спісам крыніц і літаратуры, дапаўненнямі і дадаткамі, можа служыць даведнікам пры падрыхтоўцы курсаў лекцый па гісторыі Беларусі і Расіі.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



# РЕЗЮМЕ

**Забавский Николай Михайлович**

## ОБЩЕСТВЕННО-ПОЛИТИЧЕСКАЯ БОРЬБА В БЕЛАРУСИ В ПРОЦЕССЕ ВЫБОРОВ И ДЕЯТЕЛЬНОСТИ РОССИЙСКОЙ ГОСУДАРСТВЕННОЙ ДУМЫ I — IV СОЗЫВОВ (1906 — 1917 ГГ.)

*Государственная дума, избирательная система, курс политический, избирательное право, борьба политическая, блок политический, партия политическая, октябристы, кадеты, эсеры, прогрессисты, православные братства, депутаты, вопрос национальный, вопрос аграрный, земства, белорусские губернии.*

***Объект исследования*** — общественно-политическая борьба в Беларуси в определенный хронологический период.

***Цель исследования*** — комплексное изучение борьбы монархических, либеральных, народнических и социал-демократических партий и групп в Беларуси в период выборов и деятельности Российской Государственной думы I—IV созывов, анализ их отношений и важнейших вопросов общественно-политической жизни страны, а также специфики их деятельности в западных губерниях.

Автор исследует направления правительственной политики в Беларуси в 1906 — 1917 гг. и ее влияние на итоги выборов в I — IV Думы.

***Новизна полученных результатов*** определяется новыми подходами, которые позволили впервые в отечестенной историографии провести комплексный анализ общественно-политической ситуации, которая сложилась в западных губерниях в период существования Государственной думы России, проанализировать отношения к Думе различных социальных пластов населения. Использование не исследованных до настоящего времени источников позволило создать общую картину деятельности Государственной думы и проследить первых белорусских парламентариев по аграрному и национальному вопросах, их отношения к самодержавию. В работе раскрыты новые аспекты условий, в которых в 1906 — 1917 гг. развивались белорусский язык и литература.

***Полученные результаты***, фактический материал могут быть использованы в процессе дальнейшей теоретической разработки проблем общественно-политической жизни, при написании трудов по истории парламентаризма, политических партий, а также историографических публикаций. Текст диссертации вместе со списком источников и литературы, дополнениями и приложениями, могут быть справочником при подготовке курсов лекций по истории Беларуси и России.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


## SUMMARY

**Zabavsky Nicolay Michailovich**

### SOCIAL-POLITICAL STRUGGLE IN BELARUS IN THE PROCESS OF ELECTIONS AND EXISTENCE OF THE RUSSIAN STATE DUMA OF THE I—IV CONVOCATIONS (1906—1917)

*State Duma, electoral system, political course, franchise, political struggle, political coalition, political party, Union of 17th of October, cadets, Orthodox fraternities, deputies, national question, agrarian problem, zemstvo, Byelorussian provinces.*

***The object of research*** is social-political struggle in Belarus in a certain chronological period.

***The aim of research*** is complex study of the struggle between monarchists, populists, liberal and social democratic parties and groups and analysis of their relations in Belarus in the period of elections to the Russian Dumas of the I-IV convocations and their administration, as well as the specific character of their activities in the western Byelorussian provinces, and significant problems of social-political life.

The author investigates the main tendencies of governmental politics in Belarus in the years of 1906—1917 and its influence on the results of the elections to the I—IV Dumas.

***The original character and novelty of the results*** are determined by the new approaches applied, which for the first time in national historiography made possible a thorough examination of the social-political situation in the western provinces in the period of the State Duma, and a careful analysis of the evaluation of Duma by various strata. A special emphasis in the research has been laid on original and yet unexplored sources of information and it has resulted in recreation of the truly picture of Duma's activities and discovery of first Byelorussian parliamentarians on national and agrarian questions and their attitude towards tzarism. The influence of political circumstances of 1906—1917s on the development of the Byelorussian language and literature has also' been in focus of this research.

***The results of the research*** and its factual material can be used for further theoretical investigations of the problems of social-political life, for papers on the history of parliamentarism and political parties as well as for publications on historiography. The text of the dissertation together with the supplement and the list of references can serve as a guide and directory book for lecture courses on history of Belarus and Russia.


*20504038*

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

***АЎТАРЭФЕРАТ***
***дысертацыі на атрыманне вучонай ступені доктара гістарычных навук***

**ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ БАРАЦЬБА Ў БЕЛАРУСІ Ў ХОДЗЕ ВЫБАРАЎ І ДЗЕЙНАСЦІ РАСІЙСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ ДУМЫ I—IV СКЛІКАННЯЎ (1906—1917 гг.)**

**Забаўскі Мікалай Міхайлавіч**

Падпісана ў друк 22.05.2000. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$. Папера пісчая.
Афсетны друк. Ум. друк. арк. 2,5. Ул. выд. арк. 2,3.
Тыраж 100 экз. Заказ 506.

Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка
Ліцэнзія ЛВ № 196 ад 04.02.98 г.

---

Ратапрынт БДПУ імя М. Танка. 220050, Мінск, вул. Савецкая, 18